# Недзяржаўныя выданні нарматыўных дакументаў Рэспублікі Беларусь як сродак даведкава-бібліяграфічнага абслугоўвання

*Любоў ДАНІЛЕНКА, старшы выкладчык кафедры дакументазнаўства і бібліяграфіі Беларускага універсітэта культуры*

1. Ва ўмовах актыўнага абнаўлення заканадаўства Рэспублікі Беларусь (РБ) як суверэннай дзяржавы патрэбы ў нарматыўна-прававой інфармацыі набылі масавы характар. Запыты, звязаныя з пошукам нарматыўных актаў дзяржаўных органаў, канцэнтруюцца ў спецыялізаваных бібліятэках (Міжнароднай юрыдычнай, Прэзідэнцкай, пры органах судовай улады, пракуратуры, юрыдычных навучальных устаноў), у інфармацыйных падраздзяленнях юрыдычных агенцтваў і фірмаў, навуковых, публічных і іншых бібліятэках.

2. У сучаснай практыцы даведкава-бібліяграфічнага абслугоўвання ў бібліятэках найбольш распаўсюджаныя даведкі па дзейным заканадаўстве. Разам з поўнатэкставымі базамі дадзеных дзейнага заканадаўства РБ РЦПІ і ІПА "Рэгістр", бібліяграфічнымі выданнямі, каталогамі і картатэкамі, неапублікаванай бібліяграфічнай прадукцыяй важным сродкам пошуку інфармацыі застаюцца выданні нарматыўных дакументаў. Яны традыцыйна разглядаюцца як крыніцы фактаграфічнага пошуку нормаў права, сродак выканання тэматычных і ўдакладняльных бібліяграфічных даведак аб дакументах.

3. У 90-я гады выданне нарматыўных дакументаў у Беларусі разам з дзяржаўнымі выдавецтвамі і арганізацыямі сталі ажыццяўляць недзяржаўныя структуры — за 1992—1995 гг. імі выпушчана каля 50 выданняў. Бясспрэчныя лідэры — "Амалфея" і "Прафесіянал". Нарматыўныя дакументы РБ выдавалі таксама Савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, юрыдычныя фірмы ("Траст", "Права", "Эканамічная адвакатура"), рэкламна-выдавецкае агенцтва "Рэпрынт" і выдавецка-паліграфічнае прадпрыемства "Новік", рэдакцыі часопісаў ("Финансы, учет, аудит", "Гермес"), акцыянерны камерцыйны банк ("Дукат"), СП ("Белпот и Ко"), інш.арганізацыі (ПКК "Вентус", ПКФ "Праметэй", кампанія "Стары свет").

4. Пятая частка выданняў — монавыданні. Сярод іх пераважаюць кодэксы законаў са змяненнямі і дапаўненнямі (грамадзянскі, аб шлюбе і сям'і, жыллёвы, аб працы, аб адміністрацыйных парушэннях, крымінальны і інш.). Такія выданні зручныя пры выкананні фактаграфічных і тэматычных даведак аб дзейным заканадаўстве. Каля 80% выданняў —зборнікі нарматыўных дакументаў. У тэматычных зборніках прадстаўлены разнастайныя нарматыўныя акты па актуальных пытаннях дзяржавы і права. Арыгінальнымі з'яўляюцца зборнікі дакументаў, прынятых пэўнымі органамі дзяржаўнай улады і кіравання: Міністэрства юстыцыі РБ — па натарыяльным афармленні пагадненняў ("Амалфея") і Пленума Вярхоўнага суда РБ ("Прафесіянал"). Два зборнікі выдадзены для пэўнай катэгорыі чытачоў — прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы (кансультацыйна-аўдытарская служба "Эканамічная адвакатура", г. Віцебск).

5. Як правіла, зборнікі нарматыўных дакументаў змяшчаюць дзейныя нарматыўныя акты вышэйшых органаў заканадаўчай і выканаўчай улады, а таксама тэксты ведамасных актаў, прынятых асобнымі міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі, Нацыянальным банкам і інш. органамі. Многія зборнікі з'яўляюцца крыніцай іх першай публікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Станоўчымі асаблівасцямі недзяржаўных выданняў нарматыўных дакументаў як сродкаў пошуку з'яўляюцца:

а) наяўнасць уступных артыкулаў, прадмоў да выданняў, каментараў да нарматыўных актаў, падрыхтаваных супрацоўнікамі Міністэрства юстыцыі і Вярхоўнага суда РБ, дыпламаванымі вучонымі-юрыстамі;

б) прадстаўленне ў загалоўках дакументаў і "змесце" зборнікаў усіх атрыбутаў дакументаў, неабходных для іх ідэнтыфікацыі;

в) прывядзенне бібліяграфічных спасылак на крыніцы першай афіцыйнай публікацыі дакументаў і паартыкульных спасылак на нарматыўныя акты, у адпаведнасці з якімі прынята апошняя рэдакцыя таго ці іншага артыкула дакумента;

г) групоўка нарматыўных актаў у зборніках па змесце і відах дакументаў з улікам іх іерархічнай супадпарадкаванасці;

д) наяўнасць прадметных паказальнікаў да кодэксаў законаў РБ, падрабязнае адлюстраванне структуры кодэксаў законаў у "змесце" выданняў;

е) публікацыя ў выданнях пералікаў страціўшых сілу актаў і спісаў выданняў нарматыўных дакументаў, якія выйшлі ці рыхтуюцца да друку.

7. Пашырэнне пошукавых магчымасцяў недзяржаўных выданняў нарматыўных дакументаў звязана з распрацоўкай храналагічных і прадметных паказальнікаў да зборнікаў дакументаў, уніфікацыяй загалоўкаў дакументаў і іх адэкватным адлюстраваннем ў "змесце" выдання, выкарыстаннем стандартаў на бібліяграфічнае апісанне ва ўнутрыкніжных спісах і спасылках, падрыхтоўкай рэдакцыйна-выдавецкіх анатацый.

## О возможной роли прикладной библиометрии в издательской деятельности

*Владимир ЛАЗАРЕВ, член Рады Белорусской библиотечной ассоциации, руководитель группы научной информации НИИ гематологии и переливания крови, г. Минск*

Терминологическое вступление, предваряющее данное сообщение, является вынужденным, поскольку, достигнув больших успехов в применении библиометрии в познании закономерностей таких глобальных объектов, как, например, социальные информационные коммуникации в целом, современные исследователи-теоретики запутали вопрос о содержании самого термина "библиометрия". (Так, на 4-м Международном съезде по библиометрии было объявлено, что термин изжил себя как якобы избыточный, что не помешало проведению, параллельно 5-му Международному съезду (по "информетрии"), семинара по "библиометрическим стандартам".) Поэтому употребление термина "библиометрия" требует определения.

Библиометрия — это совокупность методов количественных исследований документов, их собраний, коллекций, элементов-признаков (т.е. библиографических описаний, ключевых слов и т.п.). Появившись с прикладной целью совершенствования практической библиотечной работы, библиометрия вошла в методический арсенал многих наук социально-информационно-коммуникационного цикла, но не нашла широкого применения в прикладных целях совершенствования практической деятельности субъектов многих этих наук. Это относится и к издательской деятельности, хотя понятие "документ" является такой же составной частью ее, как и библиотечного дела.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ